## *СТРУКТУРА ВУЧНЁЎСКАГА САМАКІРАВАННЯ*

1. Вышэйшы орган самакіравання - **канферэнцыя вучняў.** Канферэнцыя вучняў заслухоўвае і абмяркоўвае справаздачы органаў самакіравання, вырашае пытанні арганізацыі вучняў і другія пытанні. Канферэнцыя збіраецца не радзей аднаго разу ў год.

2. Галоўным каардынуючым органам вучнёўскага самакіравання з'яўляецца **вучнёўскі камітэт**. Ён выконвае арганізацыйныя, інфармацыйна-прапагандысцкія, метадычныя функцыі. У межах гэтых функцый вучкам упаўнаважаны:
   - каардынаваць і аналізаваць работу класных калектываў;
   - распрацоўваць праграму дзейнасці класных калектываў і калектыву вучняў усёй школы; арганізоўваць яе рэалізацыю;
   - прымаць рашэнні па пытаннях грамадскай дзейнасці вучняў школы, тэрмінаў і парадка правядзення сходаў, выбараў і другіх мерапрыемстваў;
   - вывучаць і прапагандаваць вопыт лепшых вучнёўскіх калектываў;
   - арганізоўваць і каардынаваць конкурс на званне "Лепшы вучнёўскі калектыў года";
   - вызначаць павесткі для пасяджэнняў вучкама;
   - забяспечваць сацыяльнкю абарону вучняў.
   -

3. Вучкам фарміруецца са старшынь школьных цэнтраў "Праца і Парадак", "Навука і адукацыя", "Вольны час", "Спорт і здароўе", "Клопат", прэс-цэнтр. З іх ліку выбіраецца старшыня вучкама. Члены вучкама каардынуюць дзейнасць класных цэнтраў вучкама. Вучкам збіраецца па меры наебходнасці, але не радзей аднаго раза ў месяц.

4. Вучкаму падпарадкоўваюцца школьныя цэнтры. У іх склад уваходзяць старшыні класных вучнёўскіх цэнтраў- найбольш актыўныя вучні з класных калектываў. Кожны школьны вучнёўскі цэнтр узначальвае старшыня цэнтра.

   **Функцыі школьных вучнёўскіх цэнтраў:**

- выпрацоўка і прыняцце рашэння;
- давядзенне прынятага рашэння да класных калектываў;
- арганізацыя выканання прынятага рашэння;
- стварэнне ўмоў для выканання рашэння;
- атрыманне інфармацыі аб ходзе выканання рашэння, яе аналіз, улік, ацэнка дзейнасці, кантроль;
- падрыхтоўка аналітычнай інфармацыі і прапаноў па паляпшэнні агульнашкольнага жыцця на вучкам школы.